# Ніл Сымонавіч Гілевіч




**НІЛ СЫМО́НАВІЧ ГІЛЕ́ВІЧ** (30 ВЕРАСНЯ 1931, В. СЛАБАДА, ЛАГОЙСКІ РАЁН, МІНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ — 29 САКАВІКА 2016). БЕЛАРУСКІ ПАЭТ І ГРАМАДСКІ ДЗЕЯЧ. ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ НАВУКІ БССР (1980 Г.). НАРОДНЫ ПАЭТ БЕЛАРУСІ (1991 Г.). ПАСЛЯ СМЕРЦІ РЫГОРА БАРАДУЛІНА Ў 2014 ГОДЗЕ НІЛ ГІЛЕВІЧ ЗАСТАЎСЯ АПОШНІМ ЖЫВЫМ, ХТО МЕЎ ЗВАННЕ НАРОДНАГА ПАЭТА БЕЛАРУСІ.

# Біяграфія

- Нарадзіўся ў сям'і Сымона Пятровіча і Кацярыны Міхайлаўны Гілевічаў, бацька быў старшынёй сельсавета. Бацькі вырашылі назваць сына Нінел (гэта значыць «Ленін» наадварот), у будучыні Гілевіч зменіць гэтае імя на Ніл

ПЕРШЫЯ ГАДЫ ПАСЛЯ 2-ОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ ПРАЦАВАЎ КАЛГАСНЫМ ПАШТАЛЬЁНАМ. У 1951 СКОНЧЫЎ МІНСКАЕ ПЕДАГАГІЧНАЕ ВУЧЫЛІШЧА. АПОШНІ ГОД ВУЧОБЫ СПАЛУЧАЎ З ПРАЦАЙ НАСТАЎНІКА Ў АДНОЙ СА ШКОЛ МІНСКА.

ЧЛЕН САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ СССР З 1954 ГОДА.
СКОНЧЫЎ ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ БДУ (1956), ПАСЛЯ АСПІРАНТУРУ ПРЫ ІМ, КАНДЫДАТ ФІЛАЛАГІЧНЫХ НАВУК (1963), ПРАФЕСАР (1978). З 1960 ПА 1986 ГОД — СУПРАЦОЎНІК КАФЕДРЫ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ГЭТАГА ЎНІВЕРСІТЭТА. З 1958 ДА 1963 Г. ПРАЦАВАЎ ТАКСАМА ЛІТКАНСУЛЬТАНТАМ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА». БЫЎ РЭДАКТАРАМ АЛЬМАНАХУ ЗАМЕЖНАЙ ЛІТАРАТУРЫ «ДАЛЯГЛЯДЫ». З 1980 ДА 1989 ГОДА — ПЕРШЫ САКРАТАР ПРАЎЛЕННЯ СП БССР, У 1981—1991 ГГ. САКРАТАР ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ СССР. У 1989—1997 ГГ. — СТАРШЫНЯ РЭСПУБЛІКАНСКАГА ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ІМЯ ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ. ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР БЮЛЕТЭНЯ ТБМ «НАША СЛОВА».

**Філалагічны факультэт**

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**




**Саюз беларускіх пісьменнікаў**

Эмблема СБП



ЗЬВЯЗДА

# ПАСТАНОВА

## Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

### аб рэарганізацыі Інстытуту Беларускай Культуры ў Беларускую Акадэмію Навук

# Творчасць

- Дэбютаваў у друку з вершамі ў 1946 годзе. Аўтар кніг паэзіі «Песня ў дарогу» (1957), «Прадвесне ідзе па зямлі» (1959), «Неспакой» (1961), «Бальшак» (1965), «Перазовы» (1967), «Лісце трыпутніку» (1968), «А дзе ж тая крынічанька» (1972), «Запаветнае» (1975), «Актавы» (1976), «У добрай згодзе» (лірыка, гумар і сатыра, 1979), «Святлынь» (1984), «Як дрэва карэннем» (1986), «Повязь» (1987). Асноўны змест паэзіі — любоў да роднага краю, асэнсаванне гістарычнага вопыту беларускага народа. У яго паэтычных творах пераважаюць традыцыйныя формы класічнай паэтыкі, тэмы гістарычнай повязі часоў і пакаленняў, памяці маленства, суровых выпрабаванняў ваенных гадоў.

Выдаў зборнік п'ес «Начлег на буслянцы» (1980) і аповесць «Перажыўшы вайну» (1988).
Раман у вершах «Родныя дзеці» (1985) ствараўся з улікам духоўнага росту чытача і ўсведамлення неабходнасці вярнуць страчаныя сацыяльныя і духоўныя каштоўнасці. Выдаў кнігі паэзіі «Жыта, сосны й валуны» (1990), «Талісман» (1994), «На высокім алтары» (1994), «Вечны матыў» (1994), «…І плямы на табе няма» (2003), «На флейце самоты» (2004). Боль і гнеў, надзея і пяшчота, туга і расчараванне — такі спектр чалавечых пачуццяў у творах Ніла Гілевіча апошніх гадоў

**ПЕРАКЛАЎ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ ТВОРЫ ЗВЫШ 400 СЛАВЯНСКІХ ПАЭТАЎ І ПІСЬМЕННІКАЎ (БАЛГАРСКІХ, СЛАВЕНСКІХ, СЕРБСКІХ, УКРАІНСКІХ, ПОЛЬСКІХ, РУСКІХ, ЛУЖЫЦКІХ І ІНШ.).**




Ніл Гілевіч
ПАЛАНЭЗ АГІНСКАГА


НАРОДНАЯ БІБЛІЯТЭКА
Ніл


svaboda.org (RFE/RL)

# Памёр 29 сакавіка 2016 года. Пахаваны на Кальварыйскіх могілках побач са сваёй жонкай Нінай Іванаўнай

Могілкі

Кальварыйскія могілкі



Брама Кальварыйскіх могілак (1830)